

НА СТАРЦЕ «БАЦЬКОЎСКАГА ТЫДНЯ» 4

ЛЮБОЎ, ЯКАЯ НІЧОГА НЕ ПАТРАБУЕ ЎЗАМЕН 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

14 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 202 (29824)

## Самая пачэсная місія

*Дарагія суайчынніцы!*

*Сардэчна віншую вас з Днём маці.*

*Гэтае цудоўнае свята напоўнена самымі шчырымі і пяшчотнымі пачуццямі да тых, чыё найвялікшае прызванне — дарыць новае жыццё, ахоўваць і саграваць яго сваёй любоўю і клопатам.*

*Радасць мацярынства — гэта ні з чым не параўнальнае шчасце, вялізная адказнасць за выхаванне дастойнага чалавека, грамадзяніна і патрыёта.*

*Светлы вобраз маці дае невычэрпныя сілы, калі мы сутыкаемся з цяжкасцямі, і памнажае радасць, калі дабіваемся поспеху. Бескарыслівая мацярынская любоў з'яўляецца арыенцірам і захавальнікам на працягу ўсяго жыцця, вучыць любіць Радзіму, тварыць дабро, паважаць нацыянальныя традыцыі.*

*Асаблівыя словы ўдзячнасці — шматдзетным мамам, жанчынам, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі развіцця, а таксама тым, хто дорыць ласку і дамашнюю ўтульнасць у прыёмных сем'ях. Схіляюся перад вялізнай сілай мацярынскіх пачуццяў і шырынёй вашай душы.*

*Дзякую вам, дарагія мамы, за нястомную самаадданую працу і штодзённы клопат аб будучыні роднай Беларусі.*

*Жадаю вам і вашым блізкім моцнага здароўя, мірнага неба, аптымізму і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Добрая нагода выдалася для журналіста, каб завітаць у госці да шматдзетнай сям'і Вольгі і Міхаіла ТРЫГУБАВЫХ з аграгарадка Кадзіна Магілёўскага раёна. За нараджэнне і добрасумленнае выхаванне пяці дзяцей Вольга Сяргееўна ўдастоена ордэна Маці. Гэтую ганаровую ўзнагароду ёй уручаць падчас урачыстага прыёму ў Магілёўскім аблвыканкаме 14 кастрычніка.

Вольга Сяргееўна знаходзіцца зараз у водпуску па доглядзе немаўляці да трох гадоў, а раней яна працавала ветэрынарным санітарам на птушкафабрыцы. Жанчына прызнаецца, што лічыць сябе шчаслівай, бо мае надзейнага мужа і пяцярых сыноў: старэйшы — васьмігадовы Дзмітрый, Аляксандр — сем, Паўлу — пяць, Аляксею — тры гады, а самы маленькі сярод брацікаў — Максім, якому ў маі споўнілася год.

**Таццяна ПАДЛІПСКАЯ, фота аўтара.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «УСЕ ЎМОЎНАСЦІ, ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЭГАІЗМ ПАВІННЫ ЗАСТАЦЦА Ў МІНУЛЫМ»




Фота БелТА.

### Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Астане на VI саміце Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі

Паважаныя кіраўнікі дэлегацый! Паважаныя ўдзельнікі саміту!

Перш за ўсё хацеў бы падзякаваць нашаму калегу — Прэзідэнту Казахстана за гасціннасць і ўмовы, створаныя для нашай плённай працы.

Сёння, пасля вымушанага перапынку, мы маем магчымасць у вочным фармаце зноў вярнуцца да абмеркавання найбольш актуальных і вострых праблем, якіх вельмі шмат за апошні час. Кожная з прадстаўленых тут краін мае сваю спецыфіку, але нас аб'ядноўвае неабходнасць як мага хутчэй выйсці з крызісу і вярнуцца на рэйкі нармальнага развіцця. Аб гэтым думаюць і ў Еўропе, і ў Азіі.

Пандэмія толькі выявіла існуючыя і да таго супярэчнасці, ускараніла стварэнне новай геапалітычнай рэальнасці, якая на самай справе пачала фарміравацца больш за чатыры дзясяткі гадоў таму. Пасля развалу Савецкага Саюза так званы калектыўны Захад, ап'янёны сваёй перамогай, страціў кантроль, не справіўся з функцыямі глабальнага рэгулятара і гаранта стабільнасці. А расплачваецца за гэта ўвесь свет.

Мы гэта добра разумелі і таму ўнеслі пэўны ўклад у забеспячэнне глабальнай бяспекі. Беларусь была адной з краін на постсавецкай прасторы, якія добраахвотна адмовіліся ад валодання ядзернай зброяй. І што мы атрымалі ўзамен? Запэўненні замест рэальных міжнародна-прававых гарантый, пустыя, нічым не падмацаваныя дэкларацыі накшталт Будапешцкага мемарандума, бясконцыя спробы дэстабілізаваць сітуацыю ў спакойнай працавітай Беларусі, а ў 2020 годзе замежныя куратары практычна адкрыта кіравалі мяцяжом.

Такі ж сцэнарый раней быў апрабаваны і ва Украіне. Да чаго ўсё прывяло — мы бачым. На шчасце, у 2022 годзе нам удалося захаваць мір на гэтай зямлі — у Казахстане. Якім чынам практыка арганізацыі дзяржаўных пераваротаў у іншых краінах і дыктат санкцыйнага пакарання дзяржаў, якія змаглі адказаць на гэты выклік, упісваюцца ў нормы міжнароднага права? Такім пытаннем ужо нават ніхто не задаецца. Наш адказ павінен быць адназначны: гэта недапушчальна і нясе ў сабе рызыкі распальвання трэцяй сусветнай вайны, у якой пераможцаў не будзе.

СТАР. 2

## КОРАТКА

• **Памятны знак аб падзеях на Проні ў гады ВАВ усталююць у Чавускім раёне.**

• «Віцебскі лістапад» сёлета прысвеццяць творчасці паэта Давіда Сімановіча.

• **Выстава-кірмаш «Прадэкспа» пройдзе ў Мінску 15—18 лістапада.**

ISSN 1990 — 763X

22202

9 771990 763008

З нагоды

## СЭРЦЫ З ЧЫСТАГА ЗОЛАТА



**14 кастрычніка — не толькі свята жанчын, якія падарылі сваім дзеткам жыццё, сталі для іх надзейнай апорай. Дзень маці — свята яшчэ і тых, хто без астатку аддае душу і сэрца малым, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Моцныя духам і з невычэрпнай любоўю да кожнага, яны не дзеляць дзяцей на «сваіх» і «чужых».**

Дом дзіцяці... У кожнага чалавека, пэўна, гэтае словазлучэнне адгукаецца непрыемнымі эмоцыямі. Маё знаёмства з Віцебскім абласным спецыялізаваным Домам дзіцяці пачалося нечакана, з тэлефоннага званка. Былая школьная настаўніца расказала гісторыю, якая здарылася ў яе сям'і. Нарадзіўся ўнук з цяжкасцямі здароўя, немаўляці спатрэбілася медыцынская дапамога. І яе аказалі работнікі менавіта гэтага Дома, прычым не «казённа», а з пяшчотай і ўвагай. Дзякуючы кваліфікаванасці ўрачоў і неабыякавага стаўлення да сітуацыі Віцю выхадзілі, а спецыялісты абласнога Дома дзіцяці і дагэтуль заязджаюць у госці да свайго маленькага пацыента, цікавяцца яго справамі і поспехамі ў дзіцячым садку.

Няўжо стэрэатыпы аб установе такога тыпу ўжо не адпавядаюць рэчаіснасці і ці сапраўды адносна невялікі будынак на ўскрайку горада па праве называюць Домам, дзе жыве любоў? Каб знайсці адказ на гэтыя пытанні, мне хапіла дзвюх гадзін.

СТАР. 4

# «УСЕ ЎМОЎНАСЦІ, ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЭГАІЗМ ПАВІННЫ ЗАСТАЦЦА Ў МІНУЛЫМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Задумацца павінны ўсе, паколькі сітуацыя ў галіне бяспекі катастрафічна пагаршаецца не толькі ў Еўропе, але і ва ўсім свеце.

Ланцуг канфліктаў, які ўзрушыў Стары Свет, ужо дакаціўся і да Азіі. Прычым заходнія краіны, якія прапануюць свае міратворчыя паслугі, на справе толькі падліваюць масла ў агонь і не зацікаўлены ў дээскалацыі. Іх мэта — усіх пасварыць, падзяліць, атрымаць бескантрольны доступ да рынкаў і рэсурсаў.

З'яўляючыся часткай вялікай Еўразіі, Беларусь не можа ігнараваць сённяшні стан спраў у рэгіёне. Упэўнены, што надышоў час аб'яднаць свае намаганні і разам процістаяць праблемам, з якімі мы сутыкнуліся і якія не зможам пераадолець паасобку.

Перш за ўсё эканоміка. Моцнымі мы будзем, толькі калі зможам атрымліваць выгаду з сумеснай работы і вырашаць самыя адчувальныя пытанні паставак энерганосьбітаў, прадуктаў харчавання, угнаенняў, выбудоўвання лагістыкі і атрымання доступу на рынкі.

Усе ўмоўнасці, пратэкцыянізм і нацыянальны эгаізм павінны застацца ў мінулым.

Наша разуменне мэт нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі ў тым, каб разам ствараць механізмы супрацоўніцтва па шырокім спектры пытанняў без прыціскання і санкцый. Нам патрэбны фарматы найбольшага спрыяння гандлю, інвестыцыям, адкрытыя граніцы для тавараў, паслуг, рабочай сілы, а таксама новыя транспартныя калідоры.

Увесь патэнцыял еўразійскага рэгіёна велізарны. Гэта каласальная рэсурсная база і вытворчыя магутнасці, спажывецкі рынак, роўных якому няма. Зразумела, што роля кантынента будзе ўзрастаць. Толькі ў азіяцкіх краінах выпрацоўваецца трэць сусветнага валавога ўнутранага прадукту, а іх насельніцтва складае больш за 4 млрд чалавек.

Рэспубліка Беларусь разглядае ўзаемадзеянне з дзяржавамі Азіі ў якасці аднаго з прыярытэтаў сваёй знешняй палітыкі.

Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, мы падтрымліваем цеснае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з цэнтральнаазіяцкімі партнёрамі па Еўразійскім саюзе. Наша краіна ўдзельнічае ў рэалізацыі кітайскай ініцыятывы «Пояс і шлях». Мы з'яўляемся заходнім фарпостам АДКБ, але пры гэтым актыўна кантактуем з усімі нашымі саюзнікамі ў рэгіёне адказнасці гэтай арганізацыі.

Нашы ініцыятывы — ад шырокага міжнароднага дыялогу па ўмацаванні мер даверу да «пояса лічбавага добрасуседства» — арыентаваны на стварэнне непадзельнай, усёабдымнай архітэктуры бяспекі, у рамках якой мірна суіснуюць дзяржавы і народы.

Пашырэнне супрацоўніцтва Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і НУМДА здольна закласці магутны падмурак як для паспяховага развіцця еўразійскай прасторы, так і для бяспекі дзяржаў, якія ўдзельнічаюць у гэтых аб'яднаннях.

Мы можам стаць добрым прыкладам узаемадзеяння для еўрапейскага рэгіёна, дзе сістэма стрымліванняў і процівag, створаная ў 90-я гады мінулага стагоддзя, трашчыць па швах і развальваецца.

Упэўнены, што з улікам перамяшчэння фокуса глабальнай палітыкі і эканомікі ў Азію, дынамічнага развіцця трансканцінентальных гандлёва-эканамічных сувязяў, пан'еўразійскіх інфраструктурных і лагістычных праектаў як ніколі актуальнае далейшае пашырэнне дыялогу і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі нарады.

Паважаныя ўдзельнікі саміту!

Якая будзе канструкцыя новага светапарадку, дзе афармяцца новыя полюсы сусветнай палітыкі і які будучы баланс сіл — шмат у чым залежыць і ад нашай з вамі калектыўнай волі і палітычнай адказнасці. Сёння, як ніколі раней, яны важны, таму што гаворка ідзе пра будучыню нашых дзяцей і ўнукаў.

Перакананы, што нарада па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі адыграе важкую ролю ў працэсах прыняцця адказных рашэнняў, якія будуць садзейнічаць пабудове мірнай і прадказальнай будучыні. Беларусь да такой сур'ёзнай работы гатова як палітычна, так і эканамічна.

Падводзячы вынік, можна сказаць: настаў час Азіі, і вельмі важна гэты час не ўпусціць!

Дзякую за ўвагу.

## Сустрэчы на палях саміту

**Аляксандр Лукашэнка на палях саміту правёў серыю міжнародных сустрэч і перагавораў, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

У афіцыйнай абстаноўцы двухбаковыя сустрэчы прайшлі з гаспадаром саміту Прэзідэнтам Казахстана Касым-Жамартам Такаевым, Прэзідэнтам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам і Прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам.

Таксама вядома аб праведзенай размове на палях саміту з намеснікам Старшыні КНР Ван Цішанем. З ім у тым ліку абмяркоўвалася будучая сустрэча з кіраўніком КНР.

З Эмірам Катара шэйхам Тамімам бен Хамадам аль-Тані адбыўся абмен меркаваннямі. Размова ішла аб кантролі і рэвізіі сумесных праектаў. Аляксандр Лукашэнка запрасіў шэйха наведаць з візітам Беларусь.

«На нагах» пагутарыў Аляксандр Лукашэнка з Прэзідэнтам Кыргызстана Садырам Жапаравым. Абмеркавалі сітуацыю ў рэгіёне, эканамічныя сувязі дзвюх краін.

Кароткія размовы на актуальныя тэмы адбыліся і з прэзідэнтамі Азербайджана Ільхамам Аліевым і Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым.

Ініцыятыўна паразмаўляла з Прэзідэнтам Беларусі і намеснік гендырэктара па Еўразіі і краінах Балканскага рэгіёна МЗС Ізраіля.

Гаварылі аб узаемаадносінах з Ізраілем. Сама Сімона Халперын з Санкт-Пецярбурга, Беларусь ведае добра, цяпер пазнаёмілася з кіраўніком беларускай дзяржавы асабіста.

## Каментарый у тэму

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант расказала аб тым, якія вынікі прыносіць удзел кіраўніка дзяржавы ў вялікіх міжнародных самітах і якія вынікі, у тым ліку на двухбаковым трэку, у адносінах з рознымі краінамі, паведамляе БелТА.**

«На прадмет абмеркавання ўдзелу Беларусі ў Нарадзе па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і іншых такіх арганізацыях. І тых размоў, якія наконт гэтага гучаць. Я хачу адзначыць некалькі прынцыповых момантаў», — сказала Наталля Эйсмант у гутарцы з журналістамі.

### Кантроль на самым высокім узроўні

Першае, у чым важнасць такіх мерапрыемстваў, у якіх Прэзідэнт прымае ўдзел: на такіх пляцоўках ёсць магчымасць пракантраляваць на самым высокім узроўні, як выконваюцца дамоўленасці. «Напрыклад, Кітай. З намеснікам старшыні КНР Ван Цішанем сёння ў Прэзідэнта адбылася прадметная размова, у час якой шмат што ўдалося абмеркаваць. Гэта і практычныя пытанні беларуска-кітайскіх адносін, і будучая сустрэча Прэзідэнта Беларусі і Старшыні КНР», — адзначыла прэс-сакратар.

Таксама кароткая размова на палях саміту НУМДА ў Астане адбылася з Эмірам Катара шэйхам Тамімам бен Хамадам бен Халіфой аль-Тані. «Гэта зноў жа — кантроль і рэвізія сумесных праектаў — у галіне, напрыклад, будаўніцтва і не толькі», — расказала Наталля Эйсмант.

### Планы на будучыню

Другое — кароткія сустрэчы, калі фарміруюцца планы двухбаковых адносін. Яны не з'яўляюцца ў класічным разуменні двухбаковымі сустрэчамі. Тым не менш падчас гэтых сустрэч лідары вызначаюць перспектыву. Тут як прыклад — сустрэча з Прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам. У час нядаўніх перагавораў у Самаркандзе былі вызначаны механізмы дзеяння па развіцці адносін: гэта і работа гандлёва-эканамічных камісій, затым сустрэча міністраў замежных спраў у Ісламабадзе. Пасля — візіт Прэзідэнта Беларусі ў Пакістан.

«Аднак у рэалізацыі планаў адбылося тармажэнне. Тут жа, разумеючы гэта, Прэм'ер-міністр Пакістана прапанаваў сустрэцца і коратка перагаварыць. І сёння яшчэ раз дамовіліся — трэба паскарацца! Усё задуманае будзе рэалізавана, і ў найбліжэйшы час кульмінацыяй вялікай праведзенай работы павінен стаць візіт Прэзідэнта ў Пакістан», — заявіла прэс-сакратар.

### Фундаментальныя сустрэчы

Трэці найважнейшы момант — фундаментальныя сустрэчы. Такія 13 кастрычніка ў Астане адбыліся з прэзідэнтамі Турцыі і Казахстана. Яны былі загадзя вельмі сур'ёзна падрыхтаваны, хоць і прайшлі на палях саміту. У час гэтых сустрэч прынцыпова і канцэптуальна абмеркавалі шырокі спектр пытанняў.

«Парадак дня з Казахстанам зразумелы, у нашых адносінах няма ніякіх праблем. Вельмі насычанымі былі і перагаворы з Прэзідэнтам Турцыі. І па іх ходзе нечакана ўзнікла прапанова ў найбліжэйшы час сустрэцца і прадоўжыць размову ў Анкары. Гэта Прэзідэнту Беларусі прапанаваў турэцкі лідар», — падзялілася падрабязнасцямі Наталля Эйсмант.

Гэтыя і іншыя сустрэчы, падкрэсліла яна, вялікая практычная работа на перспектыву, якую даюць магчымасць праводзіць такія фарматы і пляцоўкі, калі ў адзін час разам збіраюцца два дзясяткі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў.

«І вяртаючыся да абмеркавання «трэба/не трэба» — мяркуйце самі», — рэзюмавала Наталля Эйсмант.

Кантэкст

## ФАКТАР КАЛЕКТЫЎНАЙ БЯСПЕКІ

**Днямі кітайскі партал навін «Гуаньча» («Аглядальнік») апублікаваў артыкул, у якім гаворыцца аб рашэнні прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна разгарнуць сумесную рэгіянальную групоўку войскаў. Чытачы партала ў каментарыях да артыкула віталі дадзенае рашэнне, назваўшы яго разумным ходам.**

«Гуаньча» — адзін з найбуйнейшых у Кітаі парталаў навін. Ён быў створаны ў красавіку 2012-га пры падтрымцы Шанхайскага інстытута стратэгічных даследаванняў «Чуньцю». Праз некалькі месяцаў з'явілася і мабільная платформа. Партал публікуе матэрыялы аб актуальных падзеях у Кітаі і свеце. Аўтарамі артыкулаў выступаюць кітайскія навукоўцы і даследчыкі. «Гуаньча» мае больш за 100 партнёраў сярод кітайскіх СМІ, сярод якіх — «Жэньмінь жыбаа», China Daily, Sina, Sohu, Кітайскі штотыднёвік, Кітайская ваенна-марская сетка.

У артыкуле «Гуаньча» адзначаецца, што апошнім часам Беларусь неаднаразова заяўляла аб абвастрэнні сітуацыі на яе заходніх і паўднёвых граніцах. Так, з'явілася інфармацыя, што Польшча вядзе перагаворы з ЗША аб размяшчэнні на яе тэрыторыі ядзерных узбраенняў. Паведамлялася і аб тым, што Украіна плануе нанесці ўдар па Беларусі. Беларускі лідар Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што Паўночнаатлантычны альянс разглядае варыянты магчымай агрэсіі супраць Беларусі. У гэтым кантэксце Прэзідэнт Беларусі асабліва падкрэсліў, што спецслужбы і ваенныя павінны ўважліва сачыць за развіццём сітуацыі.

У каментарыях да артыкула многія чытачы «Гуаньча» адзначалі, што ў такіх умовах рашэнне Беларусі і Расіі разгарнуць сумесную групоўку войскаў з'яўляецца выдатным ходам. «Беларусь — разумная краіна, якая паляпшае стратэгічныя адносіны з РФ і Кітаем, а Украіна, наадварот, хоча загубіць людзей», — напісаў адзін з каментатараў. «Таямнічая сіла на Усходзе толькі што перарасла ва ўсёабдымнае стратэгічнае партнёрства Расіі і Беларусі. Няхай Захад паспрабуе выступіць супраць іх, калі асмеліцца, вядома», — адзначыў яшчэ адзін каментатар. «Выдатнае рашэнне, паколькі ўсе разумеюць, што ў баявых дзеяннях ва Украіне бярэ ўдзел і НАТА», — падзяліўся меркаваннем чытач партала. «Разумны ход, які даказвае, што ЗША — толькі папяровы тыгр», — напісаў яшчэ адзін з чытачоў.

Як вядома, Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін дамовіліся аб разгортванні сумеснай рэгіянальнай групоўкі войскаў. Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы паведаміў на нарадзе па пытаннях бяспекі. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў Санкт-Пецярбургу пасля нефармальнага саміту СНД у яго адбылася сустрэча сам-насам з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. «У сувязі з абвастрэннем на заходніх граніцах Саюзнай дзяржавы мы дамовіліся аб разгортванні рэгіянальнай групоўкі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Гэта ўсё па нашых дакументах. Калі ўзровень пагрозы дасягае бягучага ўзроўню, як цяпер, мы пачынаем задзейнічаць групоўку Саюзнай дзяржавы. Аснова (я заўсёды пра гэта казаў) гэтай групоўкі — армія, Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь», — заявіў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Расіі цяпер не да гэтага канфлікту. «Яшчэ не хапала другога канфлікту. Вы ведаеце, што ў іх хапае праблем. Таму вы не разлічвайце на вялікую колькасць Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Але гэта будзе не адна тысяча чалавек», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Задачы рэгіянальнай групоўкі войскаў выключна абарончыя. Аб гэтым заявіў міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін падчас інфармавання па пытаннях ваенна-палітычнага становішча ў краіне і за мяжой. Паводле яго слоў, «усе мерапрыемствы, якія праводзяцца цяпер, накіраваны на адэкватнае рэагаванне на дзеянні паблізу нашых граніц». Узброеныя Сілы Беларусі гатовыя выконваць задачы, якія стаяць перад імі па абароне краіны, забеспячэння яе суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці, адзначыў БелТА старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Алег Белаконеў. «У любым выпадку мы павінны рэагаваць адэкватна і своечасова на ўсе рызыкі, выклікі і пагрозы, якія ўзнікаюць. Калі цяпер нам ужо ідзе прамая пагроза, а гэта паступае не першы раз. Можа быць, вядома (і кіраўнік дзяржавы аб гэтым гаварыў), яшчэ пункт кіпення не наступіў. Але ў любым выпадку мы павінны дзейнічаць так, каб мы былі ў папераджальным стане», — падкрэсліў ён.

Узаемадзеянне Беларусі і Расіі належным чынам ацанілі ва ўсім свеце. Сведчанне таму — артыкул у адным з найбуйнейшых кітайскіх навінавых інтэрнэт-парталаў, а таксама каментарыі да яго, якія адлюстроўваюць настроі ў грамадстве Паднябеснай. Там цудоўна разумеюць скіраванасць агрэсіі калектыўнага Захаду, якая падаграваецца і накіроўваецца Вашынгтонам. «Для Захаду ўсё новае — гэта старое. Па вялікім рахунку, Карфаген павінен быць разбураны. Карфаген — гэта сёння хто? Кітай, — заўважыў на нядаўняй сустрэчы з журналістамі старшыня КДБ Іван Тэртэль. — Таму гэтая ўся сітуацыя, якая разгортваецца ў свеце, нацэлена ў канчатковым выніку на супрацьстаянне росту Кітая». Відавочна, што адбываецца імклівае разбурэнне амерыканскай гегемоніі. Настае час Азіі, лакаматывам у якой выступае Кітай, справядліва заўважыў учора ў Астане Прэзідэнт Беларусі.

**Пётр ДУНЬКО.**

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

# «Традыцыйная сям'я — крыніца суверэнітэту і аснова дзяржаўнасці»

**Аб сям'і, традыцыйных каштоўнасцях і іх значэнні для дзяржавы і грамадства на старце Тыдня бацькоўскай любові мы гутарым са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ.**



***— Уладзімір Паўлавіч, 21 кастрычніка беларусы ўпершыню адзначаць новае свята — Дзень бацькі. Як вы мяркуеце, яно прыжывецца ў народзе?***

— Вядома, прыжывецца. У нашай славянскай традыцыі спрадвеку закладзена шанаванне старэйшых, паважлівае стаўленне да бацькоў. Дзень маці, аб'яўлены ўжо ў незалежнай Беларусі, сёння без перабольшання адно з самых значных свят у нашым календары. Але ж аснова чалавечага жыцця ў адзінстве жаночага і мужчынскага пачаткаў, і абодва бацькі павінны мець павагу і пашану. Таму ўстанаўленне Дня бацькі — заканамернасць. А яго абвяшчэнне праз тыдзень пасля Дня маці яшчэ раз дэманструе значнасць цэласнасці сям'і і каштоўнасныя арыенціры дзяржавы.

Лічу, што ў грамадстве выспеў запыт на афіцыйнае замацаванне гэтага свята. Яно нясе глыбокі філасофскі сэнс і пасыл сусветнай супольнасці — беларусы гатовы абараняць нацыянальныя інтарэсы, адстойваць традыцыйную сям'ю, мацярынства, бацькоўства, дзяцінства і права жыць сваім укладам. Сям'я — саюз жанчыны і мужчыны, а муж і жонка маюць ва ўсім роўныя правы. Гэта адлюстравана ў абноўленай Канстытуцыі краіны і чарговы раз замацавана на ментальным узроўні.

***— Гэта таксама і наш выразны адказ прасоўванню заходніх каштоўнасцяў, у якіх сям'я як саюз мужчыны і жанчыны фактычна ўжо не існуе...***

— Сёння варта казаць пра інфармацыйна-псіхалагічную экспансію, аб'ектам якой з'яўляюцца традыцыі, каштоўнасці, індывідуальная і масавая свядомасць. Робіцца спроба перафарматавання гістарычнага кода нацый, разбурэння каштоўнасных арыенціраў народаў шляхам укаранення ідэалогіі «талерантнасці». Нас спрабуюць пераканаць, што сям'я — гэта перажытак мінулага, што наяўнасць таты і мамы — неабавязковая, а кожны індывід у праве самастойна вызначаць гендарную прыналежнасць.

У рамках прасоўвання ўласных каштоўнасцяў аб'яднаны Захад легалізуе аднаполыя шлюбы і наркотыкі, узмоцнена прапагандуе трансгендарныя змены і апраўдвае педафілію. Дайшло да таго, што прадстаўнікі сексуальных меншасцяў абвяшчаюцца «сумленнем нацыі», а іх наяўнасць ва ўладных структурах аб'яўляецца паказчыкам «дэмакратычнасці» і адкрытасці краіны. Учарашняя апора еўрапейскага хрысціянства — Іспанія, на заканадаўчым узроўні разглядае магчымасць гендарнага самавызначэння падлеткаў, адкрытыя вычварэнцы ўхваляюцца на ўрадавым узроўні, а адмова ад «сексуальнай асветы» караецца заканадаўча.

Усё гэта транслюецца на Беларусь. Робяцца спробы ўкараніць гэтыя «прагрэсіўныя каштоўнасці» ў свядомасць грамадзян, разбурыць гістарычную сувязь пакаленняў, стварыць класічнае грамадства спажывання са скажонай мараллю і адсутнасцю маральных прынцыпаў...

***— Традыцыйна асноўным аб'ектам падобнага інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння з'яўляецца моладзь. Як засцерагчы маладое пакаленне ад дэструктыўнага ўплыву?***

— Канфлікт бацькоў і дзяцей існаваў ва ўсе часы. Моладзь па сваёй прыродзе схільная да адмаўлення і імкнення да пераўтварэнняў. У той жа час моладзь — гэта будучыня грамадства і краіны, аснова развіцця і прагрэсу.

Хочаш выхаваць грамадзяніна і патрыёта — ствары вакол яго адпаведнае асяроддзе. І гэта дзяржаўная праблема, для вырашэння якой павінны быць прыцягнуты ўсе існуючыя сілы і сродкі. З маладымі людзьмі трэба мець зносіны як з роўнымі, казаць праўду і тлумачыць, што ўсё ў жыцці мае сваю цану, не ўзнікае з ніадкуль і не даецца проста так. Асабісты прыклад і далучэнне да працы, выхаванне калектывізму і павагі да старэйшых, прывіццё навыкаў крытычнага мыслення і ўмення пераадольваць цяжкасці, псіхалагічная адаптацыя і нацыянальныя каштоўнасці — гэта элементы сістэмы фарміравання маладога грамадзяніна. Як бы гэта ні гучала банальна, але менавіта своечасовае тлумачэнне, што такое добра і што такое дрэнна, цесныя зносіны з дзецьмі і пастаянная ўвага дазваляюць мінімізаваць знешні дэструктыўны ўплыў на маладое пакаленне, накіраваць яго патэнцыял на стварэнне.

Невыпадкова ў абноўленай Канстытуцыі краіны замацавана норма аб тым, што «дзяржава садзейнічае духоўнаму, маральнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю моладзі, стварае неабходныя ўмовы для яе свабоднага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства».

***— Ці можна сказаць, што сёння менавіта стаўленне да традыцыйнай сям'і — індыкатар жыццяздольнасці дзяржавы і народа?***

— Як я ўжо сказаў, менавіта традыцыйная сям'я сёння выступае аб'ектам ментальна-інфармацыйнай атакі аб'яднанага Захаду. Яна па-ранейшаму застаецца базісам маральнасці і захавальнікам кода нацыі. Мы на заканадаўчым узроўні абвяшчаем сям'ю прыярытэтам, а яе абарону — найважнейшай дзяржаўнай функцыяй.

Беларусь, невялікая краіна ў цэнтры Еўропы, адстойвае ўласную пазіцыю і не адмаўляецца ад яе, нягледзячы на знешнія нападкі і абвінавачанні, ідзе ўласным шляхам і дэманструе свету, што заходнія каштоўнасці заганныя і віртуальныя па сутнасці. Любы нармальны чалавек разумее, што ў дзіцяці павінны быць тата і мама, а трансгендарны пераход — крайняя мера, якая рэалізоўваецца па медыцынскіх паказаннях. У свеце і Еўропе дастаткова разумных людзей, якія аб'ядноўваюцца ў палітычныя партыі і рухі, якія адстойваюць традыцыйныя каштоўнасці і хрысціянскую спадчыну ўласных народаў. У гэтых умовах традыцыйная СЯМ'Я становіцца найважнейшым элементам нацыянальнай бяспекі, крыніцай суверэнітэту і асновай дзяржаўнасці.

Якой будзе Беларусь заўтра — залежыць ад кожнага з нас! Мы разам пішам гісторыю нашай дзяржаўнасці, абараняючы гістарычную памяць, прытрымліваючыся духоўных традыцый, аберагаючы агульначалавечыя каштоўнасці, ствараючы краіну для дастойнага жыцця, якую перададзім сваім дзецям і ўнукам.

На заканчэнне хацеў бы павіншаваць усіх беларусаў з Тыднем бацькоўскай любові. Не забудзьце сказаць словы падзякі сваім мамам і татам, якія далі вам жыццё і выхавалі дастойнымі людзьмі.

ІТ-краіна

# ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ: ЧАС СЕНСАЦЫЙНАСЦІ ПРАХОДЗІЦЬ...

**13 кастрычніка акадэмічная супольнасць упершыню адзначыла Дзень Нацыянальнай акадэміі навук. І менавіта да гэтага свята было прымеркавана адкрыццё першай выстаўкі-форуму ІТ-акадэмгорада «Штучны інтэлект у Беларусі».**

Як расказаў журналістам **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**, менавіта 13 кастрычніка 1928 года была прынята пастанова Цэнтральнага выканаўчага камітэта і Савета народных камісараў БССР аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук. Таму пачынаючы з гэтага года рашэннем Бюро Прэзідыума НАН у акадэмічных вучоных будзе сваё карпаратыўнае свята. Яшчэ адна нагода, каб звярнуцца да гісторыі, расказаць пра дасягненні навуковых школ, прыгадаць славутых вучоных і пахваліцца дасягненнямі тых, хто робіць акадэмічную навуку сёння...

— Спадзяёмся, што выстаўка «Штучны інтэлект», якая праводзіцца сёлета ўпершыню, стане традыцыйнай і будзе нашым новым брэндам, — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў. — Мы паставілі мэту — зверыць нашы пазіцыі, вызначыць, якія распрацоўкі сёння ёсць у Беларусі ў галіне штучнага інтэлекту і куды нам рушыць далей. Гэта менавіта той напрамак, які найбольш бурна развіваецца ў свеце.

Вынікі сваіх навуковых даследаванняў прадставілі на выстаўцы 32 арганізацыі розных сфер дзейнасці і форм уласнасці.

— Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу зрабіць Беларусь ІТ-краінай, і мы ў гэтым кантэксце цяпер шчыруем. Актыўна распрацоўваем праграму развіцця мікраэлектронікі, хутка прадставім яе ўраду. Акадэмія навук узяла на сябе навуковае забеспячэнне гэтага напрамку. Вельмі актуальны сёння кірунак — развіццё беспілотнага транспарту. Таксама ў трэндзе разумныя сістэмы — у сферы аховы здароўя і адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, «разумныя гарады». На выставе прадстаўлена больш за 100 праектаў. Гэта не проста ідэі або фундаментальныя даследаванні, а канкрэтныя практычныя распрацоўкі, якія шырока выкарыстоўваюцца ў многіх галінах і на прадпрыемствах, — дадаў Уладзімір Гусакоў.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі прэзентаваў на выстаўцы дзесяць уласных праектаў. Сярод іх — нейрасеткавы праграмны комплекс для падтрымкі прыняцця рашэнняў пры дыягностыцы захворванняў лёгкіх на аснове рэнтгенаўскіх і тамаграфічных здымкаў, сістэма камп'ютарнага мадэлявання патэнцыйных лекавых прэпаратаў супраць COVID-19, цалкам уласны праект антрапаморфнага робата NEWMAN і шэраг іншых, не менш цікавых, навукаёмістых і практычна карысных распрацовак.

«Беларуская супольнасць штучнага інтэлекту займае лідзіруючыя пазіцыі ў свеце, — заявіў **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей КРУГЛІКАЎ.** — Калі ўзяць інтэлектуальную сістэму аховы здароўя, інтэлектуальную апрацоўку здымкаў з высокай дакладнасцю, то супрацоўнікі НАН уваходзяць у ТОП-10 найлепшых вытворцаў. Нашы брэнды ведаюць і нашымі распрацоўкамі карыстаюцца ва ўсім свеце. Па інтэлектуальнай сістэме аховы здароўя мы першыя сярод краін СНД. Выстава была арганізаваная для таго, каб аб'яднаць намаганні вучоных, выкладчыкаў, інжынераў-канструктараў і праграмістаў для ўкаранення сістэм штучнага інтэлекту ў Беларусі. Каб гэтыя сістэмы працавалі без збояў і прыносілі карысць, трэба вызначыць правілы гульні і планамерна ўкараняць у рамках лічбавага развіцця краіны ў цэлым.

Як заўважыў Сяргей Круглікаў, штучны інтэлект становіцца новым фактарам, які вызначае вектары грамадскага развіцця. Яго прымяненне пашыраецца ва ўсіх сферах. У сувязі з гэтым актывізавалася дзейнасць урадаў, міжнародных арганізацый, транснацыянальных карпарацый, а таксама грамадзянскай супольнасці па фармуляванні глабальных норм і правіл у пытаннях распрацоўкі, укаранення і выкарыстання тэхналогій штучнага інтэлекту. Якія этычныя дылемы нясе развіццё штучнага інтэлекту? Ці будуць дадзеныя тэхналогіі садзейнічаць грамадскаму прагрэсу? У сувязі з беспрэцэдэнтнымі магчымасцямі ўплыву сістэм штучнага інтэлекту на чалавека і іх істотным адрозненнем ад традыцыйных інфармацыйных сістэм наступствы прынятых правілаў будуць мець глабальны характар як для эканомікі, так і для грамадства. Вельмі актуальным бачыцца актыўнае супрацоўніцтва не толькі паміж навукоўцамі ў розных галінах, але і паміж навукоўцамі, выкладчыкамі і інжынерамі-практыкамі, якія маглі б «абкатваць» досвед, інтэграваць яго і выкарыстоўваць у наступных распрацоўках.

— Любая новая тэхналогія праходзіць пэўныя стадыі. Тое ж адбываецца і са штучным інтэлектам, — падзяліўся сваім бачаннем праблемы **дырэктар Адміністрацыі ПВТ Усевалад ЯНЧЭЎСКІ.** — Яшчэ некалькі гадоў таму чаго толькі мы не чулі пра штучны інтэлект: што ён заменіць людзей і невядома, як да яго ставіцца — гэта дабро або небяспека для чалавецтва. Але сёння ў любой сферы ўжо ёсць элементы штучнага інтэлекту. Мяркую, што перыяд гучных фраз і сенсацыйнасці праходзіць, а надыходзіць час канкрэтных эфектыўных тэхналагічных рашэнняў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ



**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 15 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Вацлававіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

З нагоды

# «Хвіліна славы» і «Валошкавы сямейны баль»

## Што падрыхтавалі сталіца і рэгіёны для «бацькоўскага тыдня»

**Сёння ў Беларусі адзначаецца Дзень маці. Шэраг мерапрыемстваў і падзей прымеркаваны як да згаданай даты, так і да «Тыдня бацькоўскай любові», які сёлета праходзіць з 14 да 21 кастрычніка. Завяршыцца тыдзень урачыстасцяў у Дзень бацькі — новае дзяржаўнае свята, якое аб'яўлена з гэтага года. Раскажам пра асноўныя мерапрыемствы, што пройдуць у найбліжэйшыя дні для ўсіх бацькоў.**

У гэты дзень ў Мінску праходзіць фінал 5-га Рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года». У ім возьмуць удзел сем найлепшых сем'яў, якія перамаглі ў адборачных турах ва ўсіх рэгіёнах. У гэтыя дні таксама будуць падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава», фестывалю бацькоўскіх талентаў «Хвіліна славы».

Шэраг мерапрыемстваў традыцыйна падрыхтаваў Беларускі саюз жанчын. Мінская гарадская арганізацыя БСЖ сумесна з «Белпоштай» праводзіць акцыю «Адпраў паштоўку маме».

— Мы назіраем шмат ахвотных, у тым ліку і ў нас у Мінгарвыканкаме, напісаць паштоўку. Максімальна стараемся ахапіць сталіцу. Усе, хто пажадаў, бяруць удзел і распаўсюджваюць распрацаваную намі сумесна з «Белпоштай» паштоўку, — расказала **член прэзідыума Беларускага саюза жанчын, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА**. — Можна, вядома, і эсэмэску адправіць маме, і патэлефанаваць, але калі яна атрымае паштоўку, убачыць родны почырк свайго дзіцяці, гэта памяць, якая захаваецца.

Таксама сёння ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» праходзіць святочнае мерапрыемства з інтэрактыўнымі гульнямі для дзяцей, фотавыставай, конкурсамі, выступленнямі артыстаў беларускай эстрады і, вядома ж, віншаваннямі. У тым ліку і анлайн — тых мам, якія знаходзяцца далёка.

У рэгіёнах падчас «бацькоўскага тыдня» будуць праведзены тэматычныя форумы. У Мінскай вобласці пройдзе абласны форум «Пад крылом бацькоўскай любові». На яго запрашаюць 19 кастрычніка ў Жодзіна. 20 кастрычніка ў Віцебскай вобласці пройдзе форум «Бацькоўская любоў — вялікая сіла». У Гродзенскай вобласці ў Мірскім замку будзе арганізаваны «Першы абласны сямейны кангрэс». У праграме — уручэнне прэмій «Бацькоўская слава», «Валошкавы сямейны баль» і ўрачыстае пасяджэнне «Школы паспяховых татаў «Давер».

«Пярвічка» БСЖ у «Беларусбанку» арганізуе выстаўку «Маміна шчасце». Таксама будуць праведзены розныя акцыі і забаўляльная праграма, у тым ліку для дзяцей сацыяльна-педагагічнага цэнтра Брэста. «Пярвічка» БСЖ канцэрна «Беллегпрам» з 18 да 22 кастрычніка правядзе дабрачынны марафон «Дорым цяпло мацярынскіх сэрцаў» у сацыяльных установах, а таксама для дзяцей-інвалідаў.

На наступным тыдні для дзяцей усіх шасці сталічных сацыяльна-педагагічных цэнтраў будуць арганізаваны экскурсіі на вядучыя тэлеканалы — Белтэлерадыёкампанію, АНТ і СТБ. Пройдзе і сумеснае мерапрыемства з «Белдзяржцыркам» — дзеці з сацыяльна-педагагічных цэнтраў наведаюць закулісце, а ўвечары іх запросяць на прадстаўленне.

Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў 18 кастрычніка павіншуе жанчын сваёй арганізацыі, якія ў гэтым годзе ў чарговы раз сталі мамамі.

— Сёлета іх няшмат, усяго 20, звычайна бывае крыху больш, — адзначыла **старшыня Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў Таццяна КРАЎЧАНКА**, дадаўшы, што ў Мінску жыве 16 тысяч шматдзетных сем'яў, а ў Беларусі — больш за 120 тысяч. За апошнія 10 гадоў іх колькасць істотна павялічылася.

**Алена КРАВЕЦ.**

# СЭРЦЫ З ЧЫСТАГА ЗОЛАТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Установа аховы здароўя «Віцебскі абласны спецыялізаваны Дом дзіцяці» вядзе свой адлік з 1918 года, налета яна адзначыць свой 105-гадовы юбілей. Шмат змянілася за векавую гісторыю, у 1984-м установа атрымала статус спецыялізаванай. З 2009 года тут аказваюць паліятыўную дапамогу дзецям-сіротам з цяжкімі захворваннямі і хворым дзецям, у якіх ёсць бацькі. Такі від медыцынскай дапамогі з'явіўся ў абласным Доме дзіцяці адным з першых сярод іншых устаноў аховы здароўя, дзе знаходзіліся дзеткі маленькага ўзросту (пацыентам ад сямі гадоў аказвалі такую ж дапамогу ў Багушэўскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця). Два гады таму — у ліпені 2020-га — пры ўстанове пачаў сваю работу абласны цэнтр паліятыўнай медыцынскай дапамогі дзецям.

Тут знаходзяцца пацыенты з невылечнымі захворваннямі, якія абмяжоўваюць жыццё і патрабуюць прымянення медыцынскай дапамогі, накіраванай на пазбаўленне ад болю і аблягчэнне. Гэта па-навуковаму. Самі работнікі дапамагаюць дзецям і іх бацькам у кожным асобным выпадку знайсці ўмовы для камфортнага жыцця. З такой мэтай палаты аснашчаны кіслароднымі канцэнтратарамі, апаратамі штучнай вентыляцыі лёгкіх, аксіметрамі, функцыянальнымі ложкамі, вертыкалізатарам, а яшчэ — тэлевізарамі і планшэтамі. Нядаўна ў цэнтры з'явіўся і тэхналагічны цуд — інтэрактыўная падлога: дзеці ў любую пару года могуць паслухаць і паглядзець, як трашчыць лёд пад нагамі і шамацяць асеннія лісце, а той, хто не можа сваімі ножкамі ступіць — дакранаецца рукамі. Развіццё і адаптацыя ў грамадстве (у дадзеным выпадку — з іншымі дзецьмі) — галоўны кірунак дзейнасці медыкаў і педагогаў. Кожны дзень у цэнтры паліятыўнай дапамогі пачынаецца з класічнай музыкі, пасля на змену ёй прыходзяць мультфільмы, прычым падбіраюцца яны пад густ кожнага пацыента. Цяпер у стацыянарным аддзяленні знаходзяцца 17 чалавек, а ўсяго па вобласці спецыялісты Дома дзіцяці аказваюць дапамогу больш як 200 дзецям з цяжкімі захворваннямі, інваліднасцю з чацвёртай ступенню страты здароўя.

Выхаванне такіх дзяцей — гэта пра гераічнасць і моц духу бацькоў, але і ім, на першы погляд дарослым і незалежным людзям, патрэбная дапамога. Як расказваюць урачы, у некаторых выпадках маці з дзіцем, якія прайшлі праз невыносныя жыццёвыя выпрабаванні, становяцца адным цэлым. Але, як і ўсім, ім патрэбныя зносіны і падтрымка. Таму на базе цэнтра створаны бацькоўскі клуб «Расцём разам», дзе ўсім жадаючым аказваецца псіхалагічная дапамога.

З 1 кастрычніка 2020 года на базе ўстановы аховы здароўя пачаў функцыяніраваць таксама Цэнтр ранняга ўмяшання, ён створаны з мэтай выяўлення парушэнняў развіцця і рызыкі іх з'яўлення ў дзяцей ад нараджэння да трох гадоў. Малым і іх бацькам, якія пражываюць у Кастрычніцкім раёне горада Віцебска, аказваецца бясплатная міждысцыплінарная дапамога, накіраваная на садзейнічанне аптымальнаму развіццю дзяцей і іх адаптацыі ў грамадстве.

Абласны Дом дзіцяці з'яўляецца лекава-рэабілітацыйна-выхаваўчай установай для дзяцей-сірот; тых, хто застаўся без бацькоўскай апекі; дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечных умовах. Спецыялістамі вядзецца актыўная работа з біялагічнымі бацькамі, бо для некаторых менавіта знаходжанне дзіцяці тут з'яўляецца паваротным пунктам у жыцці, дае стымул вырашыць праблемы і вярнуць дачку або сына. За мінулы перыяд бягучага года 15 выхаванцаў вярнуліся дадому, і пазітыўная дынаміка назіраецца ўжо некалькі гадоў запар. Дзеці, чые бацькі не здолелі выправіцца, уладкоўваюцца ў новыя сем'і — на сённяшні дзень такіх звыш 20 з пачатку года.

Кожны дзень у Доме за светлай агароджай — яркі і насычаны, такі, якім павінен быць у бесклапотным дзяцінстве. І гэтую магчымасць, якую не змаглі даць біялагічныя бацькі, дораць малым выхавацелі. Да кожнага свята кіраўніцтва ўстановы падыходзіць з адказнасцю: набываюць упрыгажэнні і падарункі, а яшчэ — бальныя сукенкі і касцюмы. Разам маленькія выхаванцы падрыхтоўваюць святочныя канцэрты, кожнаму знаходзіцца занятак даспадобы — цацачная музычная ўстаноўка, танцы, тэатральныя замалёўкі... Як адзначае галоўны ўрач, нават у такім узросце — ад двух да трох гадоў — ужо праяўляюцца таленты, і выхавацелі іх падтрымліваюць. 1 чэрвеня ў Дзіцячы дом прыязджаў кантактны заапарк з клоўнамі, якія падарылі дзецям радасць, паветраныя шарыкі і ўзнёслыя эмоцыі. Дзень кабачка і драніка з дэгустацыяй, Яблычны Спас з ураджаем са свайго саду, Дзень ведаў у нацыянальных касцюмах — педагогі клапатліва прывучаюць выхаванцаў да традыцый беларусаў і знаёмяць з нашай спадчынай.

Да Дня маці ў Віцебскім краязнаўчым музеі адкрылася фотавыстава пад назвай «Зазірні ў вочы дзіцяці», дзе прадстаўлены партрэты выхаванцаў дзіцячага дома ў суправаджэнні вершаў. Да канца лістапада любы жадаючы можа наведаць выставу ў будынку гарадской ратушы. У кожным позірку тут — радасць, сум, пяшчота, дзіцячыя вочы захоўваюць асабістыя гісторыі. А за кожнай усмешкай стаіць вялікая карпатлівая работа цэлага калектыву.



У Віцебскім абласным Доме дзіцяці працуе дружны калектыў урачоў, медыцынскіх сясцёр, інструктараў-метадыстаў, педагогаў, выхавацеляў, іншых спецыялістаў. Падчас нашай размовы галоўны ўрач Алена Генадзеўна Мізеркіна неаднойчы падкрэслівала, што людзей, якія знаходзяцца не на сваіх месцах, тут няма. Яна і сама прыйшла ва ўстанову ў 2001 годзе ўрачом, а з 2011-га займае пасаду кіраўніка. Больш за 20 гадоў дзеліць сваё сэрца з дзецьмі, якія аказаліся ў складанай жыццёвай сітуацыі. Але, прызнаецца, перыяд прафесійнай адаптацыі быў цяжкім. Работа з дзецьмі, асабліва такімі, — гэта выпрабаванне на трываласць. Людзьмі кіруюць два пачуцці: любоў і жаль, і калі другое праходзіць, першае — назаўсёды. Але тыя, хто прайшоў выпрабаванне, як правіла, застаюцца надоўга. У некаторых работнікаў Дома дзіцяці, чые партрэты ўпрыгожваюць Дошку гонару і суседнюю, Дошку ветэранаў працы, гэтае месца работы — адзіны запіс у працоўнай кніжцы. Так моцна прыкіпаюць людзі да Дома, дзе жыве любоў, і яго маленькіх жыхароў. А малыя знаходзяць у нянечках і выхавацелях родныя душы, і ў гісторыі ўстановы шмат выпадкаў, калі гэтае яднанне вылівалася ва ўсынаўленне або афармленне апекі работнікамі. Наогул тут не дзеляць дзяцей на «сваіх» і «чужых». Для ўсіх — з аднолькавай цеплынёй і ўвагай — работнікі Дома дзіцяці на некаторы час становяцца матулямі, кругласутачна працягваючы руку дапамогі і нястомна ахінаючы крыламі ад няшчасцяў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Рэкордная колькасць краін заявіла аб неабходнасці развіваць атамную энергетыку

Такую тэндэнцыю акрэсліў намеснік генеральнага дырэктара МАГАТЭ Міхаіл Чудакоў на панэльнай сесіі па атамнай энергетыцы ў рамках Расійскага энергетычнага тыдня. Аб гэтым паведамілі БелТА ў прэс-службе Міністэрства энергетыкі Беларусі. Геапалітычная сітуацыя і энергакрызіс, выкліканы санкцыямі і разбурэннем сістэмы забеспячэння Еўропы вуглевадародамі, прывялі да росту попыту на атамную энергію, адзначыў Міхаіл Чудакоў. У асобных еўрапейскіх краінах плацяжы за газ і электрычнасць для насельніцтва выраслі ў тры разы і больш. «Мы назіраем узрослую цікавасць да атамнай энергетыкі. Паводле нашага прагнозу, устаноўленая магутнасць АЭС да 2050 года вырасце да 873 гВт, — расказаў намеснік гендырэктара. — На мінулай Генеральнай канферэнцыі МАГАТЭ рэкордная колькасць краін заявіла аб неабходнасці развіваць атамную энергетыку. Усяго 50 дзяржаў, у тым ліку 27 — Еўрасаюза». Цяпер атамныя электрастанцыі эксплуатуюцца ў 32 краінах свету. Яшчэ 30 дзяржаў рыхтуюцца да будаўніцтва такіх аб'ектаў.

## СААЗ папярэдзіла аб новай хвалі пандэміі COVID-19

Пагаршэнне статыстычных паказчыкаў па заражэнні каранавірусам у Еўропе сведчыць аб пачатку новай хвалі пандэміі. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на сумесную заяву еўракамісара па ахове здароўя, рэгіянальнага дырэктара па Еўропе СААЗ і дырэктара Еўрапейскага цэнтра прафілактыкі і кантролю захворванняў. «У Еўропе мы зноў назіраем рост паказчыкаў, што сведчыць аб пачатку новай хвалі інфекцыі», — падкрэсліваецца ў заяве. Пры гэтым адзначаецца, што верагоднасць адначасовай цыркуляцыі каранавіруса і грыпу можа паставіць пад пагрозу найбольш уразлівых жыхароў і ўзмацніць ціск на сістэмы аховы здароўя. Спецыялісты па-ранейшаму лічаць, што вакцынацыя — адна з найбольш эфектыўных мер у барацьбе з абодвума вірусамі. Таксама з заявы вынікае, што мільёны людзей у еўрапейскім рэгіёне дагэтуль не былі вакцынаваныя супраць каранавіруса, у сувязі з чым краінам варта паспрабаваць ахапіць вакцынацыяй непрышчэпленых жыхароў.

## У Новай Зеландыі на бераг выкінулася паўтысячы чорных дэльфінаў

Чорныя дэльфіны (грынды) загінулі, выкінуўшыся на бераг новазеландскага вострава Чатэм, перадае ABC News са спасылкай на мясцовыя ўлады. Большасць памерла, не дачакаўшыся дапамогі, некаторых ратавальнікам прыйшлося ўсыпіць з-за немагчымасці транспартаваць іх назад у ваду. Дэпартамент аховы прыроды Новай Зеландыі адзначыў, што масавая гібель чорных дэльфінаў адбылася праз пару тыдняў пасля таго, як 230 кітоў выкінуліся на бераг аўстралійскага вострава Тасманія. Тады валанцёры паспелі выратаваць 35 жывёл.

Кіно

# ПРАЯВІЦЬ СЯБЕ Ў ІМЯ ВЯЛІКАЙ МІСІІ

**У суботу ў эфіры «Беларусь 3» пакажуць ваенныя драмы «Загад: агонь не адкрываць» (1981) і «Загад: перайсці граніцу» (1982) ад рэжысёра Юрыя Іванчука. Кінастужкі не толькі дэманструюць падзеі мінулага, але і нагадваюць пра каштоўнасць адвагі і вернасці сваёй справе і Радзіме, што вельмі адгукаецца ў кантэксце сённяшніх падзей у свеце.**

Першы фільм «Загад: агонь не адкрываць» пераносіць гледача ў жнівень 1941 года. У гэты час на Захадзе ідуць жорсткія баі, а зноў сфарміраваны батальён пад камандаваннем капітана Ціханава цягніком накіроўваецца на маньчжурскую граніцу. Спачатку байцам здаецца, быццам задача іх чакае зусім лёгкая, аднак пазней разумеюць, што на граніцы з Японіяй неспакойна. Правакацыі, гібель таварышаў — усё гэта трымае ў напружанні, але байцы не губляюць унутранага настрою...

Другая частка дылогіі — гэта ўжо падзеі на Далёкім Усходзе ў жніўні 1945 года. Батальён ужо вядомага нам па першым фільме маёра Ціханава атрымлівае загад перайсці мяжу. Камандаванне ўскладае на салдат адказную місію — ліквідаваць апошні ачаг вайны. Бо, нягледзячы на тое што афіцыйна СССР ужо перамог фашысцкую Германію, баявыя дзеянні яшчэ не скончаны. І людзі працягваюць гінуць



за краіну... Якім выдаўся фінал для кожнага з удзельнікаў батальёна, даведаемся на сацыякультурным у суботу 15 кастрычніка.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 176

**№ 140**



**№ 140** Васіль Марцінкевіч (Глыбокае)

**Белыя простыя:** g1, b2, f2, h2, g3, f4, g5 (7)

**Чорныя простыя:** a3, d4, e5, b6, d6, e7, h8 (7)

**№ 141** Анатоль Чорнапішчук (Масква)

**Белыя простыя:** b2, f2, a3, c3, e3, b4, d4, f4, a5 (9)

**Чорныя простыя:** c5, b6, d6, f6, h6, c7, b8, f8, h8 (9)

Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

З 19 да 25 верасня ў РЦАП па шахматах і шашках адбыўся чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па шашках-100 (Першая ліга). Мужчынскі турнір праводзіўся па швейцарскай сістэме ў 9 тураў сярод 25 удзельнікаў. Перамог кандыдат у майстры Яўген Жукоўскі (Мінск). Пуцёўкі ў вышэйшую лігу таксама атрымалі кандыдаты ў майстры Данііл Лапчук (Гомель), Мікіта Васько (Жодзіна) і Яўген Капусцін (Бабруйск). У жанчын спаборнічалі 13 шашыстак. Першае месца заняла міжнародны майстар Вера Хвашчынская (Бабруйск). Яшчэ тры пуцёўкі ў вышэйшую лігу атрымалі кандыдат у майстры Яўгенія Швед (Мінск), першаразрадніцы Дар'я Кардымон (Бабруйск) і Таісія Яновіч (Магілёў). Паглядзіце цікавыя прыклады гульні.

**№ 142** В. Разаеў — М. Васько

**Белыя простыя:** 46, 41, 36, 38, 31, 34, 26, 30, 24, 25 (10)

**Чорныя простыя:** 32, 27, 22, 23, 16, 17, 11, 12, 14, 15 (10)

Белыя фарсіравалі нічыю 1. 26-21 17:37 2. 24-19 32:43 3. 19:06=

**№ 143** Т. Яновіч — В. Хвашчынская

**Белыя простыя:** 45, 37, 33, 35, 30, 25 (6)

**Чорныя простыя:** 27, 22, 24, 19, 14, 15, 9 (7)

Чорныя рэалізавалі сваю перавагу з дапамогай ахвяры. 1...09-13 2. 45-40 13-18 3. 40-34 15-20 4. 34-29 27-31! 5. 37:26 22-27 +

**№ 144** Н. Куртава — А. Лемцюгова

**Белыя простыя:** 47, 48, 49, 50, 42, 43, 44, 45, 36, 31, 32, 35, 27 (6)

**Чорныя простыя:** 26, 24, 16, 18, 12, 6, 8, 9, 10, 1, 2, 3, 5 (6)

Абедзве саперніцы не заўважылі камбінацыю. Знайдзіце яе. У партыі было 1. 32-28?

1...26:37 2. 42:31 12-17?, і цяпер ужо белыя правялі пераможны ўдар. Пакажыце яго.

Дзве наступныя пазіцыі — па правілах бразільскіх шашак.

**№ 145** Marcos Nascimento

**Белыя простыя:** e1, g1, b2, d2, f2, h2, g3, b4, d4, c5 (10)

**Чорныя простыя:** h4, a5, g5, h6, a7, c7, e7, g7, b8, f8 (10)

**№ 146** Д. Камчыцкі (Магілёў)

**Белыя простыя:** d2, h2, b4, d4, c5, дамка: g1 (6)

**Чорныя простыя:** a3, g3, f4, h4, f6, c7, e7, g7 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні: Выпуск № 176 ад 30.09.22.**

№ 133

1. e7-d8 a7:c5 2. d8-e7 (Прыватнае пабочнае рашэнне:

2. d8-c7 d4:b2 3. e5-d6 c5:e7 4. f6:d8 h4:f6 5. d8:a1 x., знайшоў С. Бурко)

d4:b2 3. e7:b4 a3:c5 4. e5-d6 c5:e7 5. f6:d8 h4:f6 6. d8:a1+

№ 134 1. b2-c3 d4:b2 2. a1:c3 a7-b6 3. c3-d4 a5:e5 4. g5-f6 e5:g7 5. h6:a7 +

№ 135 1. g1-h2 a5:c3 2. h2:f4 e5:g3 3. a1-b2 c3:a1 4. g5-f6 a1:g7 5. h6:h4 +

№ 136 1. 29-23 33:22 2. 25-20 14:34 3. 23:01 34-39 4. 01-06 22-27 5. 06:44 27-32 6. 44-33 32-37 7. 33-47+

№ 137 1. 07-02 37:46 2. 47-41 46:37 3. 19-13 30:08 4. 02:23 32-38 5. 23-29 38-43 6. 29-40 35:44 7. 50:48 +

№ 138 h6, c7, c3, e7, a7(g1 A1), fe3, +

№ 139 a5, c7, f2, h6(g3), e3(h2), g1(a7), d2, a7, de3, +

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ІХ АГУЛЬНАЕ — СЛУЖЭННЕ МАСТАЦТВУ

**Калі хочацца культурнай праграмы і пры гэтым не жадаеш выходзіць з дому, заўсёды можа выручыць тэлевізар. Так, у найбліжэйшыя выхадныя можна знайсці на тэлеэкране канцэрты, спектаклі, а таксама праграмы пра тых, хто ўсё гэта на сцэне ўвасабляе.**



